Нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

Канферэнцыя Нацыянальнай платформы
Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства:

## "Грамадзянская супольнасць Беларусі: напярэдадні трэцяй штогадовай сустрэчы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства"

*Мінск, 29 кастрычніка 2011 года*

## Рэзалюцыя

Мы, удзельнікі Канферэнцыі Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, адзначаем відавочныя дасягненні беларускай грамадзянскай супольнасці цягам апошніх гадоў і заяўляем аб неабходнасці працягу далейшай кансалідацыі і каардынацыі дзеянняў нашых арганізацый у рамках Нацыянальнай платформы. Мы таксама:

- канстатуем, што ініцыятыва ЕС "Усходняе партнёрства" патэнцыйна можа стаць важным інструментам ажыццяўлення ключавых рэформ у сферах дзяржаўнага кіравання, эканомікі, экалогіі, культуры, кантактаў паміж людзьмі ў напрамку большага набліжэння да сучасных еўрапейскіх норм і стандартаў.

- падзяляем мэты і задачы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, выказваем надзею на далейшы рост яго ролі і значэння ў рамках ініцыятывы ЕС "Усходняе партнёрства".

- падтрымліваем афіцыйную пазіцыю Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, звернутую Саміту Усходняга партнёрства (Варшава, 29 верасня 2011 года), у прыватнасці, мы вітаем падыход Еўрапейскай камісіі і ЕС, якія прызнаюць беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці і створаную імі Нацыянальную платформу як неад'емную частку Форума, нягледзячы на дэ-факта прыпыненае узаемадзеянне з беларускім урадам.

- з жалем канстатуем негатоўнасць беларускай дзяржавы да паглыблення ўзаемадзеяння ў рамках Усходняга партнёрства, у прыватнасці, яе нежаданне адпавядаць высокім стандартам ЕС у галіне развіцця дэмакратыі і гарантый правоў чалавека. Нягледзячы на ігнараванне беларускімі ўладамі ўдзелу ў шэрагу вымярэнняў і структурных кампанентаў Усходняга партнёрства (такіх, як абмеркаванне пытанняў судовай рэформы у рамках Інструмента Усходняга партнёрства Савета Еўропы ды інш.), мы заяўляем аб неабходнасці абавязковага ўключэння Беларусі ў гэтыя працэсы, а таксама аб гатоўнасці ўдзелу ў іх грамадзянскай супольнасці ў статусе экспертаў і назіральнікаў.

- зноў заклікаем Урад і МЗС Рэспублікі Беларусь перагледзець сваю палітыку ў дачыненні да Усходняга партнёрства, пашырыць і інтэнсіфікаваць удзел краіны ва ўсіх заяўленых у яе рамках вымярэннях.

- цалкам падзяляем Дэкларацыю кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў прадстаўнікоў ЕС і яго краін-членаў аб сітуацыі ў Беларусі, ухваленую на апошнім Саміце Усходняга партнёрства. Мы салідарныя з заклікам дадзенай Дэкларацыі да неадкладнага вызвалення і рэабілітацыі ўсіх палітычных зняволеных, спынення рэпрэсій у дачыненні да грамадзянскай супольнасці і незалежных медыя, пачатку палітычнага дыялога з дэмакратычнай грамадскасцю. Мы падкрэсліваем недапушчальнасць прыняцця рэпрэсіўных законаў, якія ў значнай і крытычнай ступені абмяжоўваюць канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь, і патрабуем зняцця ўсіх існуючых неправавых абмежаванняў для дзейнасці грамадзянскай супольнасці ў краіне.

- лічым настойлівай неабходнасцю аператыўную выпрацоўку пакрокавага плана (“дарожнай карты”) па нармалізацыі адносін Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім Саюзам для паўнавартаснага ўдзелу нашай краіны ў ініцыятыве ЕС “Усходняе парнёрства”. Нацыянальная платформа Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства заяўляе пра сваю гатоўнасць выступаць пляцоўкаў для выпрацоўкі такога плана, а таксама механізмам яго рэпрэзентацыі і прасоўвання як для Еўрапейскага Саюза, так і для беларускіх ўлад.

- заклікаем усе адказныя палітычныя і грамадскія сілы Беларусі да ўдзелу ў стварэнні гэтага плана для таго, каб ён адлюстраваў кансалідаваныя падыходы і стаў рэальнай падставай для супольных і паслядоўных высілкаў па забеспячэнні канструктыўнага беларуска-еўрапейскага дыялога і ўзнаўленні поўнафарматнага функцыянавання ініцыятывы ЕС “Усходняе парнерства”.